Безумоўна, вельмі важна любіць, не забываць, шанаваць малую радзіму, ганарыцца ёю, гэта значыть быць патрыётам. Важна, каб кожны з нас зрабіў нешта істотнае і для малой, і для вялікай радзімы, памножыў матэрыяльныя і духоўныя набыткі сваіх землякоў. Неафіцыйным гімнам беларусаў лічыцца песня «Радзіма мая дарагая» на словы Алеся Бачылы. У гэтым унікальным вершы самыя звычайныя і зразумелыя словы напоўнены пранікнёнай сыноўняй любоўю да радзімы: «Радзіма мая дарагая, / Ты ў шчасці жаданым жыві! / Я сэрцам табе прысягаю / У шчырай сыноўняй любві! <...> Мне лепей ад роднага краю / Нічога на свеце няма. <...> Радзіма мая дарагая, / Красуйся і ў шчасці жыві!»

Традыцыі Івана Мележа ў апісанні малой радзімы, прызнанні ў сыноўняй любові да яе творча прадаўжалі і прадаўжаюць іншыя пісьменнікі, ураджэнцы Палесся, не толькі яго сучаснікі і сябры І. Шамякін, І. Навуменка, але і маладзейшыя – У. Ліпскі, У. Верамейчык, В. Казько, А. Федарэнка, У. Лякін, В. Ярац, Г. Дашкевіч і іншыя.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Куляшоў, Ф. Іван Мележ. Літаратурная біяграфія / Ф. Куляшоў. Мінск : Маст. літ., 1968. – С. 74. – 180.
2. Бугаёў, Д. А я яму ўдзячны / Д. Бугаёў // ЛіМ. – 2002. – 22 ліст. – С. 13.
3. Мележ, І. Трохі загадак і думак /І. Мележ // Пяцьдзясят чатыры дарогі: аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мінск : Маст. літ., 1963. – С. 387–391.

УДК 811. 16

## АБ ПАХОДЖАННІ ЎЛАСНЫХ ІМЁНАЎ

*Студэнт – Хвашчэўская А.С., 16 ім, 1 курс, ФПіК;*
*Буслаеў У.Д., 18 рпт, 1 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Мантур А.Я., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя:** у артыкуле прааналізаваныя найбольш цікавыя беларускія імёны паводле паходжання і значэння.

**Ключавыя словы:** асоба, паходжанне, уласнае імя, характар.

Хто з нас не цікавіўся, адкуль узялося яго імя. Знайсці правільны адказ на такое пытанне не зусім проста, хоць цікавасць не праходзіць, не страчваецца на працягу ўсяго жыцця [1, с. 15].

Нармалізацыя ўласных імёнаў у беларускай мове адбылася даволі позна, і тут, як зазначае В. В. Шур, «многа ўмоўнага, што нават да нашага часу не паддаецца асэнсаванню, маючы на ўвазе лінгвістычныя і іншыя фактары» [2, с. 42].

Прааналізуем найбольш цікавыя, на нашу думку, жаночыя беларускія імёны паводле паходжання і значэння:

*1. Алеся* – імя славянскага паходжання, якое азначае «дзяўчынка з лесу». Па іншай версіі яно трансфармавалася ад старажытнагрэчаскага імя Аляксандра, якое азначае «абаронца».

Такое імя належыць высакароднай, моцнай, сціплай і спагадлівай дзяўчыне з моцнай харызмай. Алеся вельмі актыўная, імкнецца за дзень зрабіць вельмі шмат спраў. Сяброўкі любяць яе за шчырасць, дабразычлівасць. Поспеху ў кар'еры дасягае за кошт нестандартнасці мыслення і разважлівасці. Працавітая Алеся – пазітыўны чалавек, які здольны знайсці выхад з любога цяжкага становішча, не падае духам і робіць правільныя вывады. Дзяўчына на ўсё мае свой пункт гледжання, які заўсёды лічыць патрэбным абараняць.

*2. Імя Вікторыя* перакладаецца з лацінскай мовы як «перамога». Жанчына з такім іменем – напорыстая, упартая, хітрая, актыўная. Пры гэтым Вікторыя добрая, вельмі нерашучая і сарамлівая асоба. Яна акцэнтуе ўвагу на прыгажосці, да працы ставіцца адказна, імкненнецца заслужыць павагу розумам і сваімі прафесійнымі якасцямі. Поспех да гэтых дзяўчын прыходзіць пазнавата, але Віка дабіваецца яго, дзякуючы сваёй ўпартасці і стараннасці. У яе ёсць творчы пачатак, яна можа быць пісьменнікам, артыстам, музыкай. Жанчыны з гэтым іменем знешне вельмі прывабныя і абаяльныя, таму могуць закружыць галаву любому мужчыне. Сяброў у Вікі няшмат. Яна аддае перавагу мець некалькі надзейных таварышаў.

Вікторыя – гэта шчырая і душэўная дзяўчына, якая з любоўю і павагай ставіцца не толькі да сваіх блізкіх і сяброў, але да ўсіх людзей увогуле.

3. *Імя Надзея* мае грэчаскія карані і з'яўляецца літаральным перакладам старажытнагрэчаскага імя Элпіс, якое насіла адна з трох сясцёр. Яны лічыліся галоўнымі хрысціянскімі дабрачыннасцямі. Сёстры Вера, Надзея і Любоў прынялі пакутніцкую смерць за непахісную веру ў Хрыста.

У імені Надзея заключаны магутны патэнцыял. Гэта даказваюць шматлікія яго ўладальніцы. Усе яны незвычайныя асобы, дабіваюцца вялікіх поспехаў у жыцці. Надзея – гэта вельмі незалежная дзяўчына, для якой свабода – гэта сэнс жыцця. Ёй трэба рабіць усё тое, што яна захоча. Імя надзяляе сваю ўладальніцу цяжкім характарам. Такая дзяўчына мае патрэбнасць у актыўным жыцці. Ёй можна парэкамендаваць спорт, танцы, турызм і інш. Надзея можа арганізаваць любое мерапрыемства, выкарыстоўвае сваю прывабнасць для дасягнення сваіх мэт.

З часам характар Надзеі робіцца мякчэй – гэта можа здарыцца тады, калі ў яе жыцці з'явіцца стабільнасць і ёй не трэба будзе нічога даказваць усяму свету.

Такім чынам, уласныя імёны людзей лічацца асобнымі, нават унікальнымі знакамі ў сістэме моў кожнай мовы.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Успенский Л.В. Ты и твоё имя / Л.В. Успенский. – Москва, 2002.
2. Шур В.В. Стан і асноўныя напрамкі даследавання беларускай літаратурнай анамастыкі / В.В. Шур // Региональная ономастика: проблемы и перспективы исследования: сборник научных статей: составители: А.М. Мезенко, Е.А. Зайцева, О.В. Шевиринова; под научной редакцией А.М. Мезенко. – Витебск: ВГУ им. П.М. Машерова, 2016.
3. Ивашко В.А. Как выбирают имена / В.А. Ивашко. – Минск, 1988.


УДК 821.161.3

# ЧЕЛОВЕК НА ВОЙНЕ (ПО ПРОИЗВЕДЕНИЯМ В.В. БЫКОВА)


*Студенты – Казека Н.Н., 21 мо, 3 курс, ФТС;*
*Душемов Д.Б., 11 эо, 3 курс, ФПУ*
*Научный руководитель – Гринцевич Т.И., канд. филол. наук, доцент*
*УО «Белорусский государственный аграрный технический университет», г. Минск, Республика Беларусь*


**Аннотация.** На материале произведений о войне рассматривается своеобразие прозы В.Быкова, показавшего истоки героизма и нравственного выбора участников войны, сложность взаимоотношений людей в военной обстановке.

**Ключевые слова:** война, человек, подвиг, предательство, героизм.

Человек, переживший войну, никогда не забудет увиденного, услышанного, прочувствованного за это время. Именно суровая школа войны позволила талантливому писателю В. Быкову воссоздать на страницах своих произведений такие живые и разнообразные характеры, которые делают незабываемыми героев его повестей и рассказов. «Каждый художник приходит в искусство прежде всего с правдой собственного опыта, с собственным пониманием мира», – писал Василь Быков, но чем ближе этот опыт и эта правда народу, тем больший резонанс производят они, тем больше понимания и признания встречает писатель. Именно этим можно объяснить широкую популярность произведений В. Быкова, сумевших не затеряться в массе литературы на военную тематику.

Исследовать мотивы подвига – вот та творческая задача, которую решает В.Быков в каждом своём произведении. Ради этого он ставит героев в ситуации, когда человек, оставшись наедине со своей совестью, должен сделать выбор между жизнью и смертью, честью и бесчестием.

Почти неизменно герои его оказываются в трудных обстоятельствах, когда до предела раскаляются разум и чувства людей.